# ВАЙНА ЯК ВЫПРАБАВАННЕ НА ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ: ПАВОДЛЕ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ПРОЗЫ (В. БЫКАЎ, А. АДАМОВІЧ, Т. НОВАК, Т. БАРОЎСКІ)

**Вольга Кавальчук**
*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна*

Артур В. Бідл і Т. Фулвайлер, амерыканскія літаратуразнаўцы, раскрываючы сутнасць канфлікту ў прозе, пералічваюць магчымыя яго варыянты. Канфліктам яны называюць барацьбу супрацьдзеючых сіл. У мастацкім творы гэта праяўляецца наступным чынам: “Адна з супрацьдзеючых сіл, уцягнутых у канфлікт, магчыма, з’яўляецца галоўным героем. Іншая сіла (ці сілы), якая можа быць па сутнасці знешняй ці па сутнасці ўнутранай, уключае: 1) другога героя ці групу герояў, 2) сілы прыроды ці сілы сусвету, 3) грамадства ці культуру, 4) аспект уласнай асобы героя ці яго сістэмы вартасцяў” (Biddle, Fulwiler 1989: 31).

Нам падаецца, што ў творах ваеннай тэматыкі беларускай і польскай літаратуры частай з’яўляецца своеасаблівая рэалізацыя канфлікту, што спалучае ў сабе супрацьстаянне героя адразу некалькім сілам: групе іншых персанажаў і аспектам уласнай асобы. Прыклады гэтага можна знайсці ў творах выдатных беларускіх (В. Быкаў, А. Адамовіч) і польскіх (Т. Новак, Т. Бароўскі) пісьменнікаў.

Агульнай для ўсіх названых твораў аказваецца знешняя сіла – ворагі-фашысты. Аднак унутраны канфлікт герояў па-рознаму ўвасабляецца беларускімі і польскімі творцамі.

У аповесці В. Быкава *Жураўліны крык* перад чытачом выяўляецца складаная сітуацыя, у якой апынуліся шасцёра байцоў. Ім трэба выканаць загад камандзіра і бараніць чыгуначны пераезд на працягу сутак, спыняючы наступленне ворага. Адзін за адным героі твора гінуць. Калі застаюцца жывыя толькі двое салдат (трэці, старшына, памірае ў агоніі), відавочным робіцца ўнутраны канфлікт маладога хлопца, Васіля Глечыка. Аўсееў пачынае ўцякаць пасля заканчэння чарговага бою і крычыць юнаку, каб ён рабіў тое самае. Васіль не адразу разумее, што здарылася: “І калі праз момант усё стала страшэнна ясна, Глечык амаль фізічна адчуў, як пакутна сутыкнуліся ў яго душы два варожыя неўразумелыя пачуцці – прагнасць паратунку, пакуль была на тое магчымасць, і свежая яшчэ, толькі што пазнаная і гордая рашучасць стрываць. Хлопец збянтэжыўся і аж застагнаў ад гэтай нязноснай раздвоенасці” (Быкаў 1980: 99). Канчатковае вырашэнне знешняга канфлікту з ворагам не выяўлена аўтарам, але канчатковае вырашэнне канфлікту ўнутранага адназначнае: малады баец працягвае змагацца. Ён забівае здрадніка, не вытрымаўшы напружання ад абурэння ўчынкам Аўсеева, і вырашае біцца да канца. У вобразе жураўка,

які адстае ад чарады, выбіваючыся з сіл, Глечык адчувае нешта сугучнае сваім пачуццям і сваёй сітуацыі, але ўсведамленне самотнасці і адчаю не перамагаюць. Юнак вельмі хоча жыць, але, хутчэй за ўсё, загіне на чыгуначным пераездзе. Гэтую трагічную непазбежнасць усведамляе чытач, хоць аўтар пакідае фінал твора адкрытым. В. Быкаў паказвае, як праз унутраную барацьбу і выпрабаванні хлопец сталее. У вернасці і самаахвярнасці ён выяўляе вышэйшую мудрасць.

У аповесці *Трэцяя ракета* В. Быкаў закранае іншае пытанне: ці варта змагацца, калі тое, што табе казалася самым дарагім, перастае існаваць. Калі паміРае дзяўчына, якую кахае галоўны герой, для яго ўсё траціць сэнс. “І мне не хапае ўжо маёй душэўнай сілы, каб супрацьстаяць пагібелі, змагацца, абараняць аднаго толькі сябе” (Быкаў 1980: 223). Лазняк пачынае думаць нават пра самазабойства. Але гэтая слабасць трохі пазней знікае, калі ўнутры героя нараджаецца іншае жаданне. Гэтае жаданне перамагае ва ўнутраных сумненнях хлопца: “Не, чорта з два! Буду біцца! Адзін за ўсіх – за Жаўтыха, Папова, Лук’янава, Крывёнка. За Панасюка. Інакш мне нельга” (Быкаў 1980: 224). У выніку галоўны герой застаецца жывы, і, што больш важна, праз такое пераадольванне героем ўласнай слабасці аўтар сцвярджае простую ісціну: заўсёды варта змагацца, трэба ісці да канца, калі твая мэта годная.

А. Адамовіч у *Хатынскай аповесці* выкрывае разбуральнасць вайны для чалавечай душы. Калі Флёру, галоўнага героя, пасля пачварнага знішчэння жыхароў вёскі гоняць разам з каровамі паміж палаючых хат, а потым – за яе, далей, ён адчувае ўпэўненасць, што дзесьці побач карнікаў чакае засада партызанаў, і прагне гэтага. Думка пра тое, што кулі могуць трапіць і ў яго, зусім не пужае пасталеўшага хлопца. “Але для мяне мала, каб гэта здарылася, мне трэба быць пры гэтым, у *гэтым* – толькі так і можа завяршыцца такі дзень, а інакш яно і не скончыцца для мяне ніколі...” (Адамовіч 1976: 149). Нянавісць даводзіць Флёру амаль да шаленства. Пасля бою, у якім хлопца кантузіла, ён ачуняў і адшукаў палонных карнікаў. Партызаны не забілі іх, і Флёра не разумее, чаму. Яму падаецца, што ўсе паверылі гэтым нелюдзям, паверылі ў тое, што яны іншыя, простыя, звычайныя людзі. І сам ён бачыць, што твары змяніліся, выразы на гэтых тварах – іншыя, а ён прагне бачыць тых, хто лічыў сябе вышэйшай расай, хто глядзеў на сялян, як на быдла, каго не кранаалі крыкі маці і дзяцей, хто здольны быў кінуць немаўля ў палаючы свіран. Толькі пасля выбуху пратэсту аднаго з партызанаў супраць забойства нелюдзяў становіцца зразумелай страшэнная моц нянавісці ва ўсіх: “У гэтым амаль бяссэнсавым, але адразу зразумелым намі пратэсце супраць таго, што яны знікнуць, *схаваюцца ў смерць*, а вёска Пераходы, а тое, што там адбылося, застанецца з намі – у гэтым, мабыць, тлумачэнне, чаму мы іх пагналі далей, павялі з сабою жывых. Яны для нашай нянавісці былі замест таго холаду, які я некалі шукаў, хапаў на хаду, нёс у пачырванелай, апухлай далоні...” (Адамовіч 1976: 159). А. Адамовіч выяўляе сцэну, у якой бачна вырашэнне ўнутранага канфлікту Флёры. Ён з усяе сілы прагнуў смерці фашыста, які кіраваў аперацыяй карнікаў. Аднак, нягледзячы на гэта, Флёра працягнуў яму ствол вінтоўкі, калі той праваліўся ў багну. Не хацелася, але выратаваў. Семнаццацігадовы хлопец аказаўся мацнейшы духам за сталага чалавека, які згубіў усё чалавечае і ператварыўся ў нелюдзя.

Так, пазней карнікі загінулі. І скончылася вайна. Галоўны герой успамінае яе, наведваючы разам з жонкай і сынам Хатынь. Наступствы ж вайны засталіся. Унутраны

надлом, што адбыўся тады, незагойны. Фларыян разумее, што падман не можа доўжыцца вечна, але і разумее, што гарантаваць светлае будучае ніхто не можа. “Так, усялякае ашуканства, махлярства не можа цягнуцца бясконца: немагчыма ўсіх ашукваць вечна. Сёння гэта такая ж ісціна, як і ў даўнішнія часы. Але гэта ўжо не суцяшае, як раней” (Адамовіч 1976: 202). Чалавецтва сутыкнулася з аблíччам пачварнай вайны, якая не забудзецца тымі, каго кранула. Галоўны герой, Флёра Гайшун, ажаніўся і мае сына, але тых спадзяванняў, светлых мараў і ўяўленняў, што былі да вайны ў хлопца, не верне ніхто. Ён назаўсёды знявечаны фізічна і ўнутрана. Флёра здольны да радасці і светлых пачуццяў, аднак цяпер яго не пакідае сумненне: “Але ці ёсць цяпер у свеце хоць што-небудзь, пра што можна сказаць: і нічога больш!” (Адамовіч 1976: 205).

Т. Новак, польскі пісьменнік, у рамане *А як будзеш каралём, а як катам будзеш* выяўляе жыццё хлопца-селяніна ад дзяцінства да сталага ўзросту. Пётр адпраўляецца на вайну, а потым вяртаецца з фронта і працягвае партызанскую барацьбу ў роднай вёсцы. Па даручэннях камандзіра ён забівае тых, хто дапамагае акупантам. Яго сябра Стах гіне на вайне, другі сябра – Маісей – пасля вайны (аблаву на габрэя зладзілі здраднікі і фашысты). Каханая Пятра, Гэля, намагаецца суцяшаць яго, але не заўсёды ў яе гэта атрымліваецца. Унутраны канфлікт Пятра ўзнікае менавіта таму, што знешні канфлікт з ворагам павінен вырашаць ён. Сумленне не дае яму спакойна жыць з думкай аб забойстве іншых. Пётр кажа, што ў яго не было адвагі самому сабе прызнацца: “Ты забіў, Пётр. Забіў. І калі табе загадаюць, зноў будзеш забіваць”. Ён часта сядзеў дома ці на двары, часам быў у полі, але цяжка было глядзець у вочы людзям, таму ён пазбягаў іх. Своеасаблівае выйсце для сябе ён знаходзіць у пераносе адказнасці на ўсю супольнасць, на грамадства, якое, як яму здаецца, патрабавала ад яго забойства: “І калі я не сказаў: – Ты забіў. Ты, Стах, і ты, Маісей – і не было ў мяне адвагі ўголас вымавіць: – Ты забіў, Пётр. Ты забіў. Ты, ты, ты – тады я падумаў пра нас усіх: пра сябе, пра Гэлю, Стаха і Маісея, пра хлопцаў-пратызанаў, называючы нас – ЁН.” (Nowak 1972: 313). Пасля гэтага герою стала лягчэй: “Першы раз за некалькі тыдняў у самы поўдзень, зарыўшыся ў сена, я заснуў адразу і не прачнуўся ніводнага разу з крыкам” (Nowak 1972: 313). Аднак канфлікт з сабой да канца не быў вырашаны. Калі ў Пятра нарадзіўся сын, ён не мог узяць малога на рукі, таму што гэтымі рукамі забіваў. Родныя не разумеюць маладога бацьку. Цяпер ён здольны ўзяць адказнасць на сябе і менавіта таму, што ўсведамляе ўласную адказнасць, баіцца пакрыўдзіць малога. “Не магу, дзядуля, не магу я яго ўзяць. Я пакрыўджу яго. На ўсё жыццё пакрыўджу. <…> Вы ведаеце, пра што я кажу. Усе ведаюць. <…> Таму я не вазьму яго на рукі. Не магу. Я забіў. Забіў, дзядуля. Гэтымі рукамі забіў” (Nowak 1972: 382–383).

Калі дзядуля Якуб намагаецца апраўдаць Пятра словамі пра тое, што ўсе забівалі, калі гэта было патрэбна, аўтар вуснамі галоўнага героя акрэслівае сутнасць праблемы, якая не дае чалавеку спакою і з’яўляецца галоўным унутраным канфліктам героя: “Вы, дзядуля, забілі на вайне. Вы салдатаў забілі. А я павінен быў забіваць знянацку, са схованкі. Я павінен быў перахітрыць паштальёна, солтыса з-за вады, паліцэйскага. Толькі тады, калі я іх перахітрыў, я забіў іх” (Nowak 1972: 383).

Дзядуля Якуб знаходзіць выйсце з сітуацыі. Пасля таго, як ён сімвалічна ачысціў кінжал, якім забіваў Пётр, і сказаў, што цяпер і сам Пётр чысты, галоўны герой, перасіліўшы сябе, змог узяць сына і з радасцю падкінуць на руках. Праз такое вырашэнне ўнутранага

канфлікту героя аўтар падкрэслівае важнасць чыстаты сумлення і немагчымасці ашукаць самога сябе.

Т. Бароўскі, вядомы польскі пісьменнік, у апавяданні *Дзень на Гармэнсах* звяртаецца да тэмы жыцця ў канцлагеры. Галоўны герой, Тадэвуш, прызвычаіўся да рэалій Асвенцыма, але ўнутраны стрыжань яго захаваўся, хоць можа выдавацца, што ў гэтым чалавеку мала засталося ад сапраўдных людскіх пачуццяў. Здараецца, што ён вельмі жорсткі да іншых. Яму не шкада грэкаў, якія загінулі таму, што не ўмелі маршыраваць. Не ўзрушвае яго і дзяўчына, якая атрымлівае пакаранне за забароненыя сустрэчы з хлопцам. Але пагрозы старому габрэю, які ў Тадэвуша сапраўды выклікае абурэнне і нянавісць за тое, што павесіў уласнага сына, герой не выконвае. Ён зрабіўся цынічны ў лагеры, але здольны аддаць сваю ежу нават гэтаму старому, з якім было брыдка размаўляць, слухаючы апраўданні. Каб напалохаць яго, Тадэвуш схлусіў, што ўвечары будзе “выбарка”, своеасаблівы лагерны агляд, калі самых слабых і хворых вязняў адпраўляюць у печы Асвенцыма. Нечакана напрыканцы апавядання так і здараецца. На першы погляд здаецца, што чалавек, які прыстасаваўся да лагернага жыцця, пачынае губляць сумленне. Але Тадэвуш нікога з вязняў не забівае, нікога не б’е. Адносіны яго да звесткі пра выбарку паказваюць, што ў гэтым чалавеку засталіся звычайныя людскія пачуцці, якія зараз усчыняюць унутраны канфлікт: “Я сябе адчуваю так, быццам я вінаваты ва ўсёй гэтай выбарцы. Гэты дзіўны фаталізм слоў. У гэтым праклятым Асвенцыме нават злое слова атрымлівае моц здзяйснення” (Borowski 1972: 59). Аўтар паказвае, што без прыстасавання выжыць у Асвенцыме немагчыма, але нянавісць да ўсіх, хто ў гэтым прыстасаванні пераходзіць межы чалавечнасці, натуральная для таго, хто сам хоча застацца чалавекам. Тадэвуш не ідзе на супрацоўніцтва з фашыстамі і такім чынам супрацьпастаўляе сябе ім і іх памагатым, аднак унутрана ён не стаў канчаткова бесчалавечным, і яго вуснамі аўтар асуджае тых, хто цалкам згубіў сумленне.

Як бачым, ва ўсіх разгледжаных творах канфліктная схема складаецца як бы з двух плоскасцяў: адна – знешняя (канфлікт з рэальным ворагам, з фашыстамі), другая – унутраная (канфлікт галоўнага героя з самім сабой). Падобнае ўскладненне канфліктнай схемы дапамагае ўзмацніць антываенны пафас твораў праз увасабленне трагедыйнасці ваеннага светаўспрымання. Знешнія абставіны могуць быць рознымі: чыгуначны пераезд, перадавая, спаленая вёска, партызанскае жыццё, канцлагер. Але ўсе гэтыя абставіны аб’яднаны адным: супрацьстаянне варожай навале, адмова ад прыстасавання і поўнага падпарадкавання ёй. Галоўныя героі ў прааналізаваных творах выяўляюцца звычайнымі людзьмі, не пазбаўленымі слабасцяў (чалавек можа баяцца смерці, саромецца пачуццяў, адчуваць жаданне ўцячы і г.д.), аднак ён здольны зрабіць правільны выбар нават ва ўмовах смяротнай небяспекі. Аўтары, такім чынам, пазбягаючы ідэалізацыі персанажаў, робяць іх больш блізкімі да чытача. Незалежна ад таго, выжывае галоўны герой ці гіне, ён пераадольвае знешні канфлікт з ворагам і ўнутраны канфлікт з сабой, сцвярджаючы спрадвечныя ідэалы мужнасці і вернасці абраным вартасцям. Не застаецца без увагі і іншае: вайна нікога не пакідае такім, як раней. Кожны, каго закранула яе пачварная сутнасць, захоўвае раны ў сэрцы на ўсё жыццё. Вядомыя беларускія і польскія творцы яшчэ раз нагадваюць: нельга паўтараць такіх памылак, якія неаднаразова паўтаралі людзі. Усё чалавецтва хварэе на атрутныя пачуцці і ідэі, але трэба не забывацца пра тое, што

забойства не можа быць стваральнай сілай. Нават калі чалавек забівае ў імя справядлівасці і выратавання іншых, ён разбурае сам сябе, напаўняючыся нянавісцю, адчаем і болем. Спрадвечная біблейская мараль сцвярджаецца яшчэ раз: зло спараджае толькі зло, а дабро – дабро.

## ЛІТАРАТУРА

**Biddle, Fulwiler 1989:** Biddle, A. W., Fulwiler, T. *Reading, writing, and the study of literature*, New York – Toronto: Random House, 1989.

**Быкаў 1980:** Быкаў, В. *Збор твораў: у 4 т*. Т. 1: Аповесці. Мінск: Мастацкая літаратура, 1980.

**Адамовіч 1976:** Адамовіч, А. *Хатынская аповесць*. Мінск: Народная асвета, 1976.

**Nowak 1972:** Nowak, T. *A jak królem, a jak katem będziesz*. Warszawa: Czytelnik, 1972.

**Borowski 1972:** Borowski, T. Dzień na Harmenzach, w: Borowski, T. *Pożegnanie z Marią. Kamienny świat*, Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1972, s. 36–60.